сцены из русского быта с колядками, ворожбой под Рождество, забавами на санях и катанием яиц, пасхальными куличами и писаными яйцами, поговорками и пословицами, церквями и избушками. Исполненные в различной технике, они были как высокого, так, соответственно, и невысокого качества. Высокохудожественные производились по акварелям Л.Бакста, И.Билибина, Е.Бём, Б.Зворыкина. Бытовали и безвкусные, которые расходились на потребу мещанства. Рынок был наводнён и бюджетными почтовыми карточками с незатейливыми, слащавыми сюжетами, чаще они просто выполнялись с дорисовками и фотомонтажом. Многие из них выдерживали по нескольку переизданий и расходились огромными тиражами.

Но по сути, народные массы отлично знали именно трёх художников: Бёму, Пимоненко, а также Васнецова. Иные художники круга «Мира искусства» пользовались популярностью лишь у более просвещённой части общества. Многие, правда, даже и не знали, что излюбленного Бёма звали Елизаветой Меркурьевной… Её открытки, посвящённые праздничной тематике, Община св. Евгении выпустила в количестве 68-ми разновидностей, причём именно её работ было выпущено гораздо больше, чем чьих-либо других из 28-ми авторов, хотя её работы печатали и иные достаточно крупные издательства.

Сейчас многие филокартисты собирают почтовые карточки, воспроизводящие работы художников «Мира искусства» или оформленные ими. На первом месте, как и в те времена, по-прежнему заслуженно остаются в незаменимых лидерах почтовые открытки художницы Елизаветы Бём, которые сейчас так активно переиздаёт, воспроизводя их в репринтных изданиях, наша Национальная библиотека Беларуси. И если ещё в 2009 году их тиражирование доходило всего только до 100 штук каждого вида, то уже в 2010 – 2012 годах эта цифра заметно увеличилась в большую сторону до 1000 – 2000 экземпляров.

Елизавета Меркурьевна Бём – замечательный и непревзойденный автор множества детских «головок» и всеразличных забавных сценок с детьми, в которых главенствует «русский стиль» (рис. 9, 10). В среднем каждый из её сюжетов на то время выдерживал до трёх изданий, хотя поздравительные открытки выпускались почти всеми издательствами и, помимо прочего, массово вывозились из Европы. Но возникшая конкуренция была не властна над открытками Бём, и у неё даже имелись почтовые карточки-рекордсмены, сюжет которых издавался от 13 до 21 раза, а тираж составлял от 130 до 210 тысяч экземпляров. Очевидно, что как огромные тиражи, так и частые переиздания почтовых открыток художницы Елизаветы Бём обуславливались большим спросом, и это, тем самым, показывает нам всю палитру общественного настроения того периода.

Так, на примере одной только Елизаветы Меркурьевны Бём, хорошо прослеживаются эстетические вкусы и пристрастия широкой публики, патриотические и традиционные предпочтения наших прадедушек и прабабушек в последнее двадцатилетие правления дома Романовых.

Что же всё-таки было в работах Бём, что они пользовались такой популярностью? Первое – сентиментальность сюжетов, и второе – национальный колорит. Ведь на открытках художницы Елизаветы Бём изображались персонажи в кокошниках, сарафанах, поддевках, сапогах да лаптях, а в то время так одевалась подавляющая часть населения и люди, приобретающие эти почтовые открытки, как бы буквально узнавали на них самих себя.

**Список литературы:**


1. Лебедев, В. Художница Елизавета Меркурьевна Бем. Иллюстрированный каталог почтовых открыток / В. Лебедев. – М. : Восточный горизонт, 2001. – 64 с.: ил.
2. Борисовская, Н. Лев Бакст / Н. Борисовская. – М. : Искусство, 1978. – 120 с.: ил.
3. Комболин, Ю. Поздравительная открытка в России / Ю. Комболин. – СПб. : Торговый дом Константин, 1994. – 192 с.: ил.
4. Третьяков, В. Лети с приветом, вернись с ответом. Старые открытки / В. Третьяков // Антиквариат, предметы искусства и коллекционирования. – 2002. – № 1. – С. 112.
5. Чапкина, М. Художественная открытка: К столетию открытки в России:
7. Альбом / М. Чапкина. – М. : Галарт, 1993. – 304 с.: ил.
6. Чапкина, М. Русская рождественская и новогодняя открытка: альбом / М. Чапкина. – М. : Захаров, 2012. – 336 с.: цв. ил.
7. Шабанава, С. Час і творчасць Льва Бакста. Каталог с выстаўкі 10.02.2016 – 17.04.2016 Нацыянальны Мастацкі музей Рэспублікі Беларусь / С. Шабанава, У. Шчасны, Л. Анцух [і інш.]. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2016. – 328 с.: іл.
8. LB – Лев Бакст [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belpost.by/stamps/information-page/2016-info/13-2016-04-27/. – Дата доступа: 02.04.2017.



***Марына Бацюкова***


## МЕДЫЯМАСТАЦТВА НА АСНОВЕ ФАЛЬКЛОРУ Ў СУЧАСНЫМ ГОРАДЗЕ *(фотапраект «Сула. Непарыўнае» ў архітэктурнай прасторы Мінска)*


*Аўтар артыкула, прафесійны фатограф, перыядычна супрацоўнічае з айчыннымі СМІ ў галіне фіксацыі ўрбаністычнай культуры і адпаведных структур паўсядзённасці. Псіхалагічным і грамадскім шокам для яе сталася адкрыццё жывой традыцыі Веткаўскіх абрадаў Пасожжа, фотазамалёўкі з якіх яна здолела інтэграваць ва ўрбанізаваны ландшафт.*



***Maryna Batsiukova***


## MEDIAART THAT IS BASED ON THE FOLKLORE IN A MODERN CITY *(photo project «Sula. Inseparable» in Minsk architectural space)*


*The author is a professional photographer, who occasionally collaborates with local media in the fixation of the urban culture and the corresponding structures of everyday life. The discovery of living tradition of Vietka Pasoszha ceremonies was psychological and social shock for her. Based on that experience she made photo-sketchings that were integrated into the urban landscape.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Непарыўнасць як увасабленне жыцця… Архаічная Сула сярод муравана-цаглянай рэчаіснасці, водгукі, пахі, спевы, чырвоны колер цэглы як крыватох прасторы… Вокны, праз якія мы пазіраем на жаночы таямнічы свет нашай нацыі, на тое, што нас сфармавала. Адтуліны, куды яно зазірае, ну, як вы там? Дождж, сонца, ставок пасярэдзіне двара, скокі, дзеці, што непасрэдна адгукаюцца на жывое… Жыць, дыхаць, быць, любіць… Непарыўна…» Прыкладна так можна апісаць уражанні пасля прэзентацыі даволі нечаканага для ўсіх (мяне – як аўтара, арганізатараў, гледачоў) кампаратыўнага праекта 2016 года, які прысвечаны жывой традыцыі Веткаўскіх абрадаў Пасожжа. Фотазамалёўкі з гэтых абрадаў я здолела інтэграваць ва ўрбанізаваны ландшафт Мінска, аб'яднаць прастору, час, аўтэнтычныя спевы і пластыку ў своеасаблівы кантынуум, які спантанна матэрыялізаваўся ў дворыку Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь на фоне чырвонай «прускай» цэглы былога будынку Белвідэацэнтра (мал. 1) з удзелам маладых пераемнікаў фальклору з БДУКМ (мал. 2).



Малюнак 1 – Фотаработы праекта «Сула. Непарыўнае» ў музейным дворыку, 2016



Малюнак 2 – Гурт «Талака» кафедры этналогіі БДУКМ на прэзентацыі праекта, 2016

Я ўжо не першы год працую ў галіне дакументальнай і канцэптуальнай фатаграфіі. Асноўныя тэмы: штодзённасць, псіхалагічны стан асобы, стасункі чалавека з навакольным асяроддзем і паводзіны чалавека ў грамадстве [2]. На выстаўцы ў двары Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі былі прадстаўлены фотаздымкі праекта «Сула. Непарыўнае», у якіх я метадамі, блізкімі да аўдыявізуальнай антрапалогіі даследавала жыццё ў вёсках Неглюбка і Стаўбун Гомельскай вобласці падчас свята – абраду «Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)».



Малюнак 3 – На асобным планшэце – Ульяна Аніськова (в.Стаўбун), 2014



Малюнак 4 – На асобным планшэце – Святлана Парашчанка (в.Стаўбун), 2014

Пасожскі абрад «Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)» звязаны з зямлёй, яе ўрадлівасцю, скіраваны на ўміласціўленне прыроднай стыхіі – маланкі-стралы. Традыцыя свята пакаленнямі застаецца нязменнай: на Узвіжанне (свята адзначаецца па архаічным месяцавым календары) жыхаркі вёсак Стаўбун, Неглюбка, Казацкія Балсуны, Пералёўка, Янова Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці прыбіраюцца ў ільняныя строі (мал. 3), спяваюць і ідуць насустрач з розных бакоў вёсак, пакуль не самкнуцца ў адным карагодзе на ростані, потым – ідуць, бесперапынна спяваючы, да жыта. Нібы ткуць ручнік – дарогу радасці ды шчасця і дабрабыту. Водзяць карагоды і спяваюць, потым закопваюць у зямлю «Сулу» – хаваюць цёмную сілу разбурэння, пераўтвараючы ў дабро, багацце і поспех. Збіраюць абярэгі – каласкі, падаюць і катаюцца ў жыце (мал. 4), убіраючы моц і здароўе зямлі.

Варыянт абраду «Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)» вёскі Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна ўключаны ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека і з'яўляецца нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі [1, с. 37]. Гэта – невыпадкова, бо сапраўдная культурная спадчына актуальная паўсюль: над жытам, у вокнах будынка ў прускім стылі (мал. 7), на браме сталічнага музея (мал. 8).



Малюнак 5 – Постаці ўдзельніц абраду ў ваконных праёмах цаглянага будынка, 2016



Малюнак 6 – Спеўны гурт з РГА «СЭТ» на праекце, 2016

«Сула. Непарыўнае». Фотаапарат дапамагае мне зафіксаваць самабытны светацень традыцыі, дзе адвечны «сталбавы» свет нябёсаў змяшаны са стракатай паўсядзённасцю вясковага жыцця. Калісьці – язычнікі, потым – хрысціяне, учора – камуністы, сёння – праваслаўныя… Але заўсёды, на ўсялякі выпадак, тройчы плюнуць цераз плячо, не забыцца правадзіць Стралу, бо жыта – павінна саспець... Гэтак можна афарыстычна абазначыць культурны сплаў, які я, паміж волі, фіксавала пад небам Веткаўшчыны.



Малюнак 7 – Верхні план праекта «Сула. Непарыўнае» ў музейным дворыку, 2016



Малюнак 8 – Вароты Нацыянальнага гісторычнага музея ў дзень прэзентацыі праекта, 2016

Абрадавыя строі прымушаюць успомніць этнаграфічныя фотаздымкі Міхася Раманюка. Толькі гэтым разам перад вамі дзіўная сітуацыя парванай повязі паміж традыцыяй і сучаснасцю. Фотаздымкі паказваюць нам адначасова стогадовыя абрадавыя сукенкі і стаптаныя кітайскія пластыкавыя сандалі. Глабалізацыя прыходзіць у гэтую вёску, але, праходзячы праз фільтр тутэйшага жыцця, становіцца вельмі асаблівай, аўтэнтычнай.

Я імкнулася ўкласці ў свае здымкі стан сінэстэзіі. Вачыма мы адчуваем водар жыта, чуем абрадавыя песні і ўдыхаем пах часныку і сала. Мы бачым спалучэнне дрымотна-старажытнага, бытавога жыцця і гумару. Свята «Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)» – гэта абрад, які далучае да непераадольнага руху жыццёвых сокаў ва ўсім, што павінна ўзысці, расці, рухацца, квітнець і налівацца. Носьбіты традыцыі і самі ўжо не ўзгадваюць, калі і з чаго ўсё пачалося. Затое законы іх архаічных абрадаў, што наўпрост вынікаюць з пашыранага тут ткацтва і вышыўкі, мясцовыя пявунні няўхільна выконваюць.

Тысячы пакаленняў змяніліся, але тая аснова, што саткалі калісьці нашыя прабабкі, зноў і зноў ўзнімаецца ўвысь валокнамі-нітамі, і чаўнок памяці хутка стварае старадаўні ўзор пакланення зямлі і небу, зёлкам і хлебу, пачатку і завяршэнню. Непарыўнасць у здольнасці змяняцца, насычацца новым, захоўваючы пры гэтым старое, пакідае адбітак ў сакавітых колерах гэтай фатаграфічнай серыі.

**Спіс літаратуры:**

1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору: вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.

2. Фотограф Марина Бацюкова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.marynabatsiukova.com. – Дата доступа: 12.02.2016.

***Маргарыта Маскяліене***

**РАЗЬБА ПА ДРЭВЕ НА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІМ ПАМЕЖЖЫ:ФОРМЫ І АРНАМЕНТЫКА ТРАДЫЦЫЙНЫХ ПОБЫТАВЫХ РЭЧАЎ**

*У артыкуле аўтар аналізуе заканамернасці традыцыйнай мастацкай апрацоўкі дрэва. Характар вырабу драўляных прадметаў (мэблі, посуду, прылад працы) у традыцыйных культурах Беларусі і Літвы мае адрозненні, але ў роўнай ступені перадае прадуманасць і эстэтызм вясковага побыту.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ